ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ВІЦЕБСКІ РАБОЧЫ

ОРГАН ВІЦЕБСКАГА АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА КАМІТЭТАЎ КП(б)Б, АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА СОВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№ 11 (7088) | Серада, 9 лютага 1944 г. | Цана 20 кап.

## П. К. Панамарэнка—Старшыня Соўнаркома Беларусі

Гомель, 7 лютага. (ТАСС). Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 7 лютага 1944 г. тав. П. К. Панамарэнка назначан Старшынёй Совета Народных Камісараў Беларускай ССР.

Тав. І. С. Былінскі назначан першым Намеснікам Старшыні Совета Народных Камісараў Беларускай ССР.

## З А Г А Д
## Вярхоўнага Галоўнакамандуючага
### Генералу арміі ТАЛБУХІНУ

Войскі 4-га Украінскага фронта, прарваўшы вельмі ўмацаваную абарону немцаў на іх плацдарме на поўдзень ад горада Нікопаль на левым беразе Днепра, за чатыры дні наступальных баёў нанеслі цяжкія паражэнні сямі пяхотным дывізіям праціўніка і вышлі да ракі Днепр на ўсім працяжэнні плацдарма.

У выніку гэтай аперацыі нашы войскі поўнасцю ліквідавалі аператыўна важны плацдарм немцаў на левым беразе Днепра працягам 120 кіламетраў па фронту і 35 кіламетраў у глыбіню.

У ходзе наступлення нашы войскі авалодалі раённым цэнтрам Запарожскай абласці гор. Каменка і занялі больш 40 другіх насялёных пунктаў.

У баях за ліквідацыю Нікопальскага плацдарма немцаў вызначыліся войскі генерал-палкоўніка Цветаева, генерал-лейтэнанта Лелюшэнка, генерал-маёра Жэрэбіна, генерал-маёра Белова, генерал-маёра Гарохава, палкоўніка Владычанскага, артылерысты генерал-лейтэнанта артылерыі Краснапеўцэва, танкісты генерал-лейтэнанта танкавых войск Свірыдава, палкоўніка Корбут і лётчыкі генерал-лейтэнанта авіяцыі Хрукіна, генерал-маёра авіяцыі Савіцкага, генерал-маёра авіяцыі Філіна, генерал-маёра авіяцыі Кузнецова і палкоўніка Пруткова.

У азнаменаванне атрыманай перамогі найбольш вызначыўшыеся ў баях злучэнні і часці прадставіць да прысваення найменавання „Нікопальскіх“ і да ўзнагароды ордэнамі.

Сёння, 8 лютага, у 20 гадзін сталіца нашай Радзімы Масква ад імені Радзімы салютуе доблесным войскам 4-га Украінскага фронта, авалодаўшым важным плацдармам ворага,—дванаццацю артылерыйскімі залпамі са ста дваццаці чатырох гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні аб'яўляю падзяку ўсім кіруемым Вамі войскам, удзельнічаўшым у баях за ліквідацыю Нікопальскага плацдарма немцаў.

Вечная слава героям, паўшым у барацьбе за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Смерць нямецкім захватчыкам!

*Вярхоўны Галоўнакамандуючы*
*Маршал Совецкага Саюза*
*І. СТАЛІН.*

8 лютага 1944 года.

## З А Г А Д
## Вярхоўнага Галоўнакамандуючага
### Генералу арміі МАЛІНОЎСКАМУ
### Генералу арміі ТАЛБУХІНУ

Войскі 3-га Украінскага фронта пры садзеянні з фланга войск 4-га Украінскага фронта, развіваючы наступленне, разбілі Нікопальскую групіроўку немцаў і сёння, 8 лютага, штурмам авалодалі горадам Нікопаль—буйным прамысловым цэнтрам Украіны.

У баях за авалоданне горадам Нікопаль вызначыліся войскі генерал-палкоўніка Чуйкова, генерал-лейтэнанта Шлёміна, генерал-лейтэнанта Лелюшэнка, генерал-маёра Купрыянава, генерал-маёра Глазунова, генерал-маёра Карамышэва, генерал-маёра Галаско, генерал-маёра Афанасьева, генерал-маёра Здановіча, генерал-маёра Сакалова, генерал-маёра Вагіна, палкоўніка Камыніна, палкоўніка Фамічэнка, падпалкоўніка Заўялава, падпалкоўніка Склярова, артылерысты генерал-лейтэнанта артылерыі Недзеліна, генерал-маёра артылерыі Левіна, лётчыкі генерал-лейтэнанта авіяцыі Судзец, генерал-маёра авіяцыі Толсцікава, генерал-маёра авіяцыі Шэўчэнка і сапёры маёра Засімук.

У азнаменаванне атрыманай перамогі, злучэнні і часці, якія найбольш вызначыліся ў баях за вызваленне горада Нікопаль, прадставіць да прысваення найменавання „Нікопальскіх“ і да ўзнагароды ордэнамі.

Сёння, 8 лютага, у 21 гадзіну сталіца нашай Радзімы Масква ад імені Радзімы салютуе нашым доблесным войскам, авалодаўшым горадам Нікопаль,--дванаццацю артылерыйскімі залпамі са ста дваццаці чатырох гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні аб'яўляю падзяку ўсім кіруемым Вамі войскам, удзельнічаўшым у баях за вызваленне горада Нікопаль.

Вечная слава героям, паўшым у барацьбе за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Смерць нямецкім захватчыкам!

*Вярхоўны Галоўнакамандуючы*
*Маршал Совецкага Саюза*
*І. СТАЛІН.*

8 лютага 1944 года.

## Ад Совецкага Інформбюро
### З аператыўнай зводкі за 8 лютага

На працягу 8 лютага на поўдзень ад Сіверскі нашы войскі з баямі прасоўваліся ўперад і занялі некалькі насялёных пунктаў, у тым ліку Моласава, Петрушына Гара, Тарковічы, Овіновічы, Баршчова, Кашыцы і чыгуначная станцыя Тарковічы.

На поўнач і на паўночны-захад ад Новасокольнікі нашы войскі прадаўжалі весці наступальныя баі, у ходзе якіх занялі некалькі насялёных пунктаў.

На поўнач ад Звенігародка і Шпола нашы войскі прадаўжалі весці баі па знішчэнню акружанай групіроўкі праціўніка і, сціскаючы кальцо акружэння, авалодалі насялёнымі пунктамі Орловец, Ксавераўка, Завадзянка, Хлыстуноўка, Валява, Емчыха, Лозкі, Варабіеўка, Слабада Міронаўка, адначасова, на поўнач ад Звенігародка нашы войскі паспяхова адбівалі атакі танкаў і пяхоты праціўніка, якія імкнуліся прабіцца на дапамогу да акружанай групіроўкі.

Войскі 3-га Украінскага фронта пры садзеянні з фланга войск 4-га Украінскага фронта, развіваючы наступленне, разбілі Нікопальскую групіроўку немцаў і 8 лютага штурмам авалодалі горадам Нікопаль—важным прамысловым цэнтрам Украіны.

Войскі 4-га Украінскага фронта, прарваўшы вельмі ўмацаваную абарону немцаў на іх плацдарме на поўдзень ад горада Нікопаль на левым беразе Днепра, за чатыры дні наступальных баёў нанеслі цяжкае паражэнне сямі пяхотным дывізіям праціўніка і вышлі да ракі Днепр на ўсім працяжэнні плацдарма. У выніку гэтай аперацыі нашы войскі поўнасцю ліквідавалі аператыўна-важны плацдарм немцаў на левым беразе Днепра працягам 120 кіламетраў па фронту і 35 кіламетраў у глыбіню. У ходзе наступлення нашы войскі авалодалі раённымі цэнтрамі Запарожскай абласці горадам Каменка, Бальшая Лепеціха і занялі больш 40 другіх насялёных пунктаў, сярод якіх буйныя насялёныя пункты Іванаўскае, Новая Днепроўка, Новае Вадзяное, Днепроўка, Вадзяное, Бальшая Знаменка, Верхні Рагачык, Карай-Дубіна, Ушкалка, Бабіна, Ніжні Рагачык, Малая Лепеціха. У гэтых баях нашымі войскамі знішчана: танкаў—53, гармат рознага калібра—217, мінамётаў—118, кулямётаў—370, аўтамашын—1277, павозак з ваеннай маёмасцю—570. Праціўнік пакінуў на полі бою звыш 15 тысяч трупаў салдат і афіцэраў. Нашымі войскамі захвачаны наступныя трафеі: танкаў—24, гармат рознага калібра—392, мінамётаў—180, кулямётаў—473, вінтовак і аўтаматаў больш 4.000, аўтамашын—1686, трактароў і цягачоў—86, матацыклаў—181, радыёстанцый—18, павозак з грузамі ваеннай маёмасці—1018, складаў з боепрыпасамі, прадавольствам і іншай ваеннай маёмасцю—20. Узята ў палон больш 2000 нямецкіх салдат і афіцэраў.

## Масіраваны налёт нашых самалётаў на г. Хельсінкі

У ноч з 6 на 7 лютага вялікая група нашых бамбардыроўшчыкаў зрабіла масіраваны налёт на г. Хельсінкі. Бамбардыроўцы ў г. Хельсінкі былі падвергнуты ваенна-прамысловыя аб'екты праціўніка, чыгуначны вузел, порт і цэнтральная частка горада.

У выніку бамбардыроўкі па назіранню экіпажаў нашых самалётаў узнікла больш 30 пажараў, якія суправаджаліся моцнымі выбухамі. Буйныя пажары адзначаны ў раёне газасховішча, воінскіх казармаў, электрамеханічнага завода, у раёне вакзала, на тэрыторыі станцыі і дэпо.

У раёне суднабудаўнічага завода і сухога дока, а таксама на тэрыторыі аўтазборачнага завода назіраліся выбухі вялікай сілы. Полымя пажараў нашы лётчыкі назіралі пры адыходзе ад цэлі з адлегласці ў 250 км.

Паветранай разведкай днём 7 лютага ўстаноўлена, што ўзнікшыя ў Хельсінкі пажары не ліквідаваны, горад прадаўжае гарэць і знаходзіцца ў дыме.

4 нашых самалёты не вярнуліся на свае базы.

# X сесія Вярхоўнага Совета СССР першага склікання

## Законы, прынятыя Вярхоўным Советам СССР

## ЗАКОН

### *аб Дзяржаўным бюджэце Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік на 1944 год*

Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік пастанаўляе:

1. Зацвердзіць прадстаўлены Советам Народных Камісараў СССР дзяржаўны бюджэт СССР на 1944 год з прынятымі па дакладах Бюджэтных Камісій Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей змяненнямі, а іменна: усяго па даходах 249.575.982 тыс. рублёў і ўсяго па расходах 249.575.982 тыс. рублёў.

2. У адпаведнасці з арт. 1-м гэтага закона зацвердзіць даходы і расходы саюзнага бюджэта па даходах у суме 214.746.836 тыс. рублёў і па расходах у суме 214.746.836 тыс. рублёў.

3. Зацвердзіць дзяржаўныя бюджэты саюзных рэспублік на 1944 год у наступных сумах:

| | Па даходах (у тыс. руб.) | Па расходах (у тыс. руб.) |
|---|---|---|
| Расійская Совецкая Федэратыўная Соцыялістычная Рэспубліка | 24.265.623 | 24.265.623 |
| з іх: рэспубліканскі бюджэт | 12.872.605 | 6.102.119 |
| мясцовыя бюджэты | 11.393.018 | 18.163.504 |
| Украінская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка | 3.640.071 | 3.640.071 |
| з іх: рэспубліканскі бюджэт | 3.118.531 | 1.617.039 |
| мясцовыя бюджэты | 521.540 | 2.023.032 |
| Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка | 429.474 | 429.474 |
| з іх: рэспубліканскі бюджэт | 404.807 | 181.380 |
| мясцовыя бюджэты | 24.667 | 248.094 |
| Азербайджанская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка | 1.011.986 | 1.011.986 |
| з іх: рэспубліканскі бюджэт | 769.854 | 408.786 |
| мясцовыя бюджэты | 242.132 | 603.200 |
| Грузінская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка | 1,174.601 | 1.174.601 |
| з іх: рэспубліканскі бюджэт | 888.091 | 485.383 |
| мясцовыя бюджэты | 286.510 | 689.218 |
| Армянская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка | 536.425 | 536.425 |
| з іх: рэспубліканскі бюджэт | 466.978 | 275.972 |
| мясцовыя бюджэты | 69.447 | 260.453 |
| Туркменская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка | 456.267 | 456.267 |
| з іх: рэспубліканскі бюджэт | 358.028 | 203.150 |
| мясцовыя бюджэты | 98.239 | 253.117 |
| Узбекская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка | 1.877.068 | 1.877.068 |
| з іх: рэспубліканскі бюджэт | 1.205.575 | 755.665 |
| мясцовыя бюджэты | 671.493 | 1.121.403 |
| Таджыкская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка | 532.110 | 532.110 |
| з іх: рэспубліканскі бюджэт | 429.662 | 206.119 |
| мясцовыя бюджэты | 102.448 | 325.991 |
| Казахская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка | 1.640.327 | 1.640.327 |
| з іх: рэспубліканскі бюджэт | 1.160.676 | 576.813 |
| мясцовыя бюджэты | 479.651 | 1.063.514 |
| Кіргізская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка | 487.627 | 487.627 |
| з іх: рэспубліканскі бюджэт | 372.961 | 203.989 |
| мясцовыя бюджэты | 114.666 | 283.638 |
| Карэла-Фінская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка | 123.567 | 123.567 |
| з іх: рэспубліканскі бюджэт | 112.033 | 87.988 |
| мясцовыя бюджэты | 11.534 | 35.579 |
| ІТАГО па дзяржаўных бюджэтах саюзных рэспублік | 36.175.146 | 36.175.146 |
| з іх: рэспубліканскія бюджэты | 22.159.801 | 11.104.403 |
| мясцовыя бюджэты | 14.015.345 | 25.070.743 |

4. Зацвердзіць адлічэнні з рэспубліканскіх бюджэтаў у бюджэты АССР і мясцовых советаў у наступных сумах:

| | (у тыс. руб.) |
|---|---|
| Расійская Совецкая Федэратыўная Соцыялістычная Рэспубліка | 6.770.486 |
| Украінская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка | 1.501.492 |
| Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка | 223.427 |
| Азербайджанская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка | 361.068 |
| Грузінская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка | 402.708 |
| Армянская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка | 191.006 |
| Туркменская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка | 154.878 |
| Узбекская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка | 449.910 |
| Таджыкская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка | 223.543 |
| Казахская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка | 583.863 |
| Кіргізская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка | 168.972 |
| Карэла-Фінская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка | 24.045 |
| ІТАГО | 11.055.398 |

5. Устанавіць на 1944 год адлічэнні ад агульнасаюзных дзяржаўных падаткаў і даходаў у рэспубліканскія і мясцовыя бюджэты ў наступных размерах:

а) ад паступленняў па падаходнаму падатку з насельніцтва ў бюджэты РСФСР, Украінскай ССР, Беларускай ССР, Азербайджанскай ССР, Грузінскай ССР, Туркменскай ССР, Узбекскай ССР, Казахскай ССР, Кіргізскай ССР—10 проц. і ў бюджэты Армянскай ССР, Таджыкскай ССР і Карэла-Фінскай ССР—100 проц.;

б) ад паступленняў па падаходнаму падатку з калгасаў і сельскагаспадарчаму падатку з калгаснікаў і аднаасобнікаў—25 проц.;

в) ад паступленняў па ваеннаму падатку—5 проц.;

г) ад даходаў машына-трактарных станцый у бюджэты ўсіх саюзных рэспублік, апрача Узбекскай ССР,—25 проц. і ў бюджэт Узбекскай ССР—10 проц.;

д) ад сумы дзяржаўнай пазыкі, размешчанай сярод насельніцтва і калгасаў,—15 проц.

6. Даручыць Совету Народных Камісараў Саюза ССР, у адпаведнасці з зацверджанымі Вярхоўным Советам СССР сумамі адлічэнняў саюзным рэспублікам ад падатку з абарота, устанавіць па кожнай саюзнай рэспубліцы процанты адлічэнняў ад гэтага падатку.

7. Даручыць Совету Народных Камісараў Саюза ССР разгледзець бюджэты Малдаўскай ССР, Літоўскай ССР, Латвійская ССР і Эстонскай ССР на 1944 год.

8. Зацвердзіць справаздачы аб выкананні дзяржаўнага бюджэта СССР: за 1940 год па даходах 180.241.347 тыс. руб. і па расходах 174.350.150 тыс. руб., з перавышэннем даходаў пад расходамі ў суме 5.891.197 тыс. руб., за 1941 год па даходах і расходах у суме 191.398.065 тыс. руб. і за 1942 год па даходах і па расходах у суме 182.841.434 тыс. рублёў.

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР**
**М. КАЛІНІН.**

**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР**
**А. ГОРКІН.**

Масква, Крэмль. 1 лютага 1944 г.

## Сапраўдныя гаспадары

На вызваленай ад праклятай немчуры частцы Расонскага раёна з першых-жа дзён закіпела работа па аднаўленню МТС.

Прышлі сапраўдныя гаспадары, знатакі сваёй справы, былыя важакі і радавыя байцы народна-партызанскай вайны. Яны знялі з плеч аўтаматы, вінтоўкі, карабіны, але пакуль што яшчэ не расстаючыся з імі, узяліся за збіранне і дастаўку да месца МТС раскіданых па лясах і дарогах частак да трактараў. На санках, на плячах, на руках за тыдзень было дастаўлена да 35 картэраў, задніх мастоў, матораў, каробак хуткасцей і г.д. Адначасова ішла работа па будаўніцтву і абсталяванню рамонтнай майстэрні, кузні, зямлянак і г. д.

Для работы ў МТС прышлі добрыя кадры яшчэ даваенных трактарыстаў, брыгадзіраў, механікаў. Агульнымі намаганнямі абсталявалі яны 2 класы для курсаў трактарыстаў, каб да вясны падрыхтаваць дастатковую колькасць новых кадраў. На курсах зараз займаецца да 70 чалавек, галоўным чынам дзяўчаты. Добра вучацца былыя партызанкі-комсамолкі Пастушкова, Лаўрыновіч, Красакова, Гаранава, Осіпава, Лапаткіна, Снотава і інш.

З гэтых дзяўчат будзе толк,—гаворыць таварыш Лазарэнка, ордэнаносец, былы камандзір аднаго з партызанскіх падраздзяленняў.—Яны,—гаворыць ён,— і немцаў білі са злосцю і ўпорствам і вучацца таксама напорыста.

На рамонце трактараў працуе больш 50 чалавек. Гэта ўсё добры, баявы народ. Вось тав. Шчэдроў Міша—брыгадзір-трактарыст, член партыі, узнагароджан урадам за адвагу ў баях з ворагам. Яго брыгада перадавая. З ім спаборнічае яго цёзка брыгадзір-трактарыст Прохараў, член партыі, былы партызан.

Узоры добрай работы на рамонце трактараў і сельгасінвентара падаюць таварышы Жураўлёў, Юлюшчэнка, Буракоў, Грыбоўскі і інш.

Па плану намечана аднавіць і адрамантаваць 35 трактараў. Каля 30 матораў і 27 задніх мастоў ужо сабрана. Чатыры трактары гатовы на 90 проц., адзін трактар ужо на-ходу.

Так, перамагаючы ўсе цяжкасці, сапраўдныя гаспадары ўзяліся за справу аднаўлення МТС.

—Трэба ўлічыць,—гаворыць дырэктар МТС таварыш Ткачэнка,—што ўсё гэта мы самі, па сваёй ініцыятыве робім, не чакаючы ніякіх прапаноў, фінансаў і інструментаў. Прышлі на пустую пляцоўку, а зараз, вось бачыце, ужо і на МТС падобна.

Для больш паспяховай работы МТС—неабходна больш сур'ёзная да яе ўвага з боку раённых арганізацый.

У гэтай частцы яшчэ многа недахопаў. Партыйная і комсамольская арганізацыі МТС за яе работу таксама нясуць адказнасць.

Уперадзе яшчэ многа справы і ў майстэрні і па падрыхтоўцы трактарыстаў. Ад якасці гэтай работы будзе залежаць поспех работы на палях, наш калгасны ўраджай.

ІГНАЦІЧ.

Адказны рэдактар А. КРУШЫНСКІ.